# • ДА XIV МІЖНАРОДНАГА КАНГРЭСА СЛАВІСТАЎ (Македонія – 2008)

*23–25 чэрвеня 2005 года ў Белградзе (Рэспубліка Сербіі і Чарнагорыі) адбылося чарговае (другое) пасяджэнне Міжнароднага камітэта славістаў. На пасяджэнні была абмеркавана і прынята тэматыка XIV Міжнароднага з'езда славістаў, які адбудзецца ў 2008 годзе ў г. Охрыд (Рэспубліка Македонія).*

## Тэматыка
## XIV Міжнароднага з'езда славістаў

(Рэспубліка Македонія, Охрыд, 2008 год)
(прынята на пасяджэнні Прэзідыума Міжнароднага камітэта славістаў у Белградзе, Сербія і Чарнагорыя, 23–25 чэрвеня 2005 года)

1.0. МОВАЗНАЎСТВА

1.1. Этнагенез славян і гісторыя славянскіх моў у сувязі з гісторыяй славянскай матэрыяльнай і духоўнай культуры. Праславянская мова і яе дыялекты. Славянская этымалогія. Стараславянская мова, яе дыялектная аснова і тэрытарыяльныя варыянты. Роля царкоўнаславянскай мовы ў фарміраванні славянскіх літаратурных моў. Тэксталогія славянскіх помнікаў.

1.2. Дыялekталогія і лінгвагеаграфія славянскіх моў. Пераходныя дыялекты. Перыферыйныя дыялекты славянскіх моў, іх узаемнае пранікненне і кантакты з неславянскімі мовамі. Славянскія элементы ў неславянскіх дыялектах. Этналінгвістыка. Актуальны стан славянскіх дыялектаў з пункту гледжання сацыялінгвістыкі.

1.3. Славянская анамастыка. Стан славянскай аніміі і яе змены. Стварэнне корпусу (баз звестак) славянскай анамастыкі. Праблемы анамастычнай лексікаграфіі.

1.4. Сучасны стан славянскіх стандартных моў. Вар'іраванне нормы. Іншамоўны ўплыў на ўсіх узроўнях. Славянскія мовы з пункту гледжання сацыялінгвістыкі. Глабалізацыя і інтэрнацыяналізацыя ў славянскіх мовах: стан і перспектывы. Тыпалогія моўных станаў і моўных сітуацый. Моўная палітыка. Сацыялінгвістычныя і псіхалінгвістычныя аспекты полілінгвізму.

1.5. Сучасныя тэорыі і метады вывучэння граматычнай структуры славянскіх моў. Камунікатыўныя аспекты граматыкі. Тыпалогія славянскіх моў. Граматыка і слоўнік.

1.6. Сучасныя тэорыі і метады вывучэння лексічнай семантыкі і фразеало-гіі. Моўная карціна свету. Кагнітыўны, канцэптуальны, этналінгвістычны, лінгвакультуралагічны падыходы.

1.7. Функцыянальныя стылі: стан і перспектывы. Размоўны функцыя-нальны стыль у славянскіх мовах. Літаратурна-мастацкі функцыянальны стыль і яго характарыстыка. Стылістыка і прагматыка. Рэлігійны функцыя-нальна-стылявы комплекс.

1.8. Славянскія мовы і корпусная лінгвістыка, праблемы рэпрэзента-тыўнасці тэкстаў.

2.0. ЛІТАРАТУРА, КУЛЬТУРА І ФАЛЬКЛОР

2.1. Эпоха Кірыла і Мяфодзія, перыяд славянскага пісьменства і Охрыдская літаратурная школа: лінгвістычныя, літаратуразнаўчыя, гісторыка-культурныя аспекты.

2.2. Славянскі фальклор. Праблемы вывучэння фальклору і традыцыйнай духоўнай культуры. Славянска-неславянскія сувязі. Тэксталогія фальклору. Узаемадзеянне фальклору і мастацкай літаратуры. Гарадскі фальклор.

2.3. Роля ідэй Асветніцтва ў станаўленні нацыянальнай самасвядомасці славянскіх народаў.

2.4. Літаратурныя напрамкі і школы ў літаратуры славянскіх народаў – традыцыі і наватарства. Рамантызм і рэалізм у літаратурах славянскіх народаў. Дэзінтэграцыя рэалізму ў канцы XIX стагоддзя і рэінтэграцыя рэалізму ў XX стагоддзі. Сімвалізм,

футурызм, экспрэсіянізм, сюррэалізм. Паэтыка мадэрнізму. Афіцыйная і неафіцыйная літаратура (1917–1989). Постмадэрнізм у славянскіх літаратурах у міжнародным кантэксце. Сучасныя з'явы ў славянскіх літаратурах. Спецыфічныя мадэлі развіцця асобных славянскіх літаратур. Фантастыка і навуковая фантастыка ў славянскіх літаратурах. Масавая літаратура.

**2.5.** Дыялог Усход – Захад у славянскіх літаратурах. Праблемы ўзаемапранікнення нацыянальных культур. Глабалізацыя, еўрапейскія інтэграцыйныя працэсы і пошукі нацыянальнай ідэнтычнасці.

**2.6.** Грамадскія аспекты славянскіх культур і літаратур (міграцыя, эміграцыя, выгнанне, шматдомнасць). Літаратура нацыянальных меншасцей у славянскіх краінах.

**2.7.** Уклад славян у сучасныя плыні ў літаратуразнаўстве: рускі фармалізм, Бахцін і яго паслядоўнікі, фенаменалогія, структуралізм, семіётыка. Славянскія школы ў вершазнаўстве.

**2.8.** Філасофская, рэлігійная і палітычная думка славян. Свецкае і сакральнае ў славянскіх культурах.

**2.9.** Кампаратывістыка, жаналогія і славянскія літаратуры.

**2.10.** Уклад славян у сусветную літаратуру. Перапляценне культур: балканіка, славіка, еўрапеіка.

**3.0.** ГІСТОРЫЯ СЛАВІСТЫКІ

**3.1.** Славянскае мовазнаўства, літаратуразнаўства, фалькларыстыка і культуралогія ў гістарычным развіцці.

**3.2.** Месца і роля славістычнай перыёдыкі: стан і перспектывы.

**3.3.** Спецыяльныя тэмы, прысвечаныя:

- жыццю і творчасці Косты Рацына (да 100-годдзя з дня нараджэння);
- жыццю і творчасці Льва Мікалаевіча Талстога (да 180-годдзя з дня нараджэння).

ПРАПАНАВАНЫЯ ТЭМЫ ДЛЯ «КРУГЛЫХ СТАЛОЎ»

1. Стан славістыкі ў свеце.
2. Славянскія літаратуры пасля 1989 года ў дыялогу з Еўропай і светам. Новыя з'явы, тэндэнцыі і перспектывы.

Заяўкі на ўдзел у XIV Міжнародным з'ездзе славістаў дасылаць да 31 мая 2006 года на адрас Беларускага камітэта славістаў:

Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі
(Беларускі камітэт славістаў)
вул. Сурганава, дом 1, корп. 2.
220072, г. Мінск, Беларусь
E-mail: inlinasbel@tut.by

У заяўцы ўказваецца:

1. Назва даклада з указаннем раздзела тэматыкі.
2. Кароткая анатацыя даклада на беларускай і англійскай мовах (да 1000 знакаў). Заўвага: Даклад павінен уключаць моўныя, літаратурныя і г.д. факты з розных славянскіх груп.
3. Прозвішча, імя і імя па бацьку дакладчыка.
4. Вучоная ступень, званне, месца працы і пасада дакладчыка.
5. Службовы і дамашні адрас, кантактныя тэлефоны, E-mail.

Тэлефоны для даведак:
(017) 284 – 15 – 94 (старшыня БКС Лукашанец Аляксандр Аляксандравіч),
(017) 222 – 36 – 02 (вучоны сакратар БКС Важнік Сяргей Аляксандравіч).

**Беларускі камітэт славістаў**